рог. Так, в 1870-е гг. на северной окраине города в связи со строительством станции Брест-Граево появляется посёлок Граевка, в восточной части, где пролегли линии на Ковель и на Киев – Киевка.

**Заключение.** Таким образом, в конце XIX в. – начале XX в. Брест являлся уездным центром, пограничным с польскими территориями городом, где располагался крупный торговый порт, значение которого заметно снизилось в изучаемый период. В уезде сформировалась разветвлённая железнодорожная сеть, проходили дороги государственного значения для гужевого транспорта. После строительства в 1830-х гг. крепостных сооружений и совершенствования системы коммуникаций город приобрёл важное военно-стратегическое значение для империи, и это послужило предпосылкой дальнейшего приобщения Бреста к событиям в мировой истории. Совершенствование системы транспортировки людей и товаров сыграло немаловажную социально-политическую и экономическую роль в жизни Брестского уезда.

### СПИСОК ЦИТИРОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ


1. Бейлькин, Х. Ю. Сельскохозяйственный рынок Белоруссии 1861–1914 гг. /Х.Ю. Бейлькин. Науч. ред. М.О. Бич. – Мн.: Наука и техника, 1989.
2. Белоруссия в эпоху капитализма: Сб-к док. и мат. в 3-х т. / АН БССР. Ин-т истории. Т. 2. Развитие капитализма в промышленности, положение промышленных рабочих и рабочее движение в Белоруссии 1861-1900 / Сост. З.Е. Абезгауз, Н.Л. Рябцевич. – Мн., 1990.
3. Бобровский, П. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния. Ч. 2 / П. Бобровский. – СПб., 1863.
4. Вывучэнне тэмы «Чыгункі і іх уплыў на эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XIX ст.» у курсе айчыннай гісторыі. Матэрыялы ў дапамогу студэнтам дзённага і завочнага навучання / Уклаў Н.І. Гарбуль. – Брэст, 1997.
5. Девять губерний Западно-Русского края в топографическом, геогностическом, статистическом, экономическом, этнографическом и историческом отношениях / Автор-состав. И. Столпянский. – СПб., 1866.
6. Жучкевич, В.А. Дороги и водные пути Белоруссии: Историческо-географические очерки / В.А. Жучкевич. – Мн., 1977.
7. Национальный исторический архив Беларуси в Гродно (далее – НИАБ в Гродно). Ф. 8, оп. 1, д. 311, л. 3. О проекте на очищение русла р. Лесной через Беловежскую пущу за 1838 г.
8. НИАБ в Гродно. Ф. 1, оп. 22, д. 1823. О речном судоходстве в Гродненской губернии 1869/1870 гг.
9. НИАБ в Гродно. Ф. 14, оп. 3, д. 71. Сведения о состоянии Гродненской губернии за 1902-1916 гг.
10. НИАБ в Гродно. Ф. 1, оп. 8, д. 1670, л. 23. О путях сообщения за 1886 г.
11. НИАБ в Гродно. Ф. 1, оп. 6, д. 114. Сведения к годовому отчёту о состоянии губернии за 1861 г.
12. НИАБ в Гродно. Ф. 1, оп. 9, д. 1367, л. 54. О путях сообщения за 1901 г.
13. НИАБ в Гродно. Ф. 492, оп. 1, д. 39. Об устройстве конно-железной дороги в Бресте за 1907 г.
14. НИАБ в Гродно. Ф. 492, оп. 2, д. 13. Проект на устройство и эксплуатацию в г. Бресте на Кобринском форштадте городских электрических железных дорог. 1898 г.
15. Солоневич, Л. Краткий исторический очерк Гродненской губернии за сто лет её существования 1802–1902 / Л. Солоневич. – Гродно: Губернская типография, 1901.
16. Шпилевский, П. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю // Современник (СПб). – 1853. – Т. XL. – Отд. II.
17. Эканамічная гісторыя Беларусі. Вучэбны дапаможнік / Выд. 2-е, дап.і перапрац. / Пад агульнай рэд. В. І. Галубовіча. – Мн., 1995.
18. Экономика Белоруссии в эпоху империализма / Под ред. Г.Т. Ковалевского и др. – Мн., 1963.


*Материал поступил в редакцию 17.11.08*


**MALYKHINA L.U. Road and transport system of the Brest district of the Grodno province at the end of XIX century - the beginning of XX century**

On the basis of materials of National historical archive of Byelorussia Grodno and literatures on a problem of development of the western - Belarus region of Russian empire the author carries out research of road and transport system Brestchiny. The special attention is given the characteristic of the district center where the large trading port settled down, the ramified railway network was generated, passed roads of the state value. It is judged, that after construction to Brest-Litovsk in 1830th of fortifications and perfection of system of communications the city has got the important strategic value for empire. Perfection of system of transportation of people and the goods has played an important role in a sociopolitical and economic life of cities of district.


УДК 93: 323.26 “18” (476)

***Папко В.М.***

# ПАЎСТАННЕ 1863-1864 ГГ. У ГІСТОРЫІ РОДУ ПАМЕШЧЫКАЎ ДЗЯКОНСКІХ

Паўстанне 1863 г. па-рознаму закранула лёсы людзей, якія ў ім удзельнічалі. Іх сем'і часам бязвінна пакутавалі ад учынкаў сваіх бацькоў, братоў і сыноў. Гэта быў не толькі боль аб загінулых у баях і сасланых у Сібір. Канфіскацыя іх маёнткаў прыводзіла да пагаршэння матэрыяльнага становішча. Расійскія ўлады вельмі падазрона ставіліся да памешчыкаў-каталікоў, бачылі ў іх пагрозу выбуху новага паўстання. Лёсы некалькіх прадстаўнікоў роду памешчыкаў Дзяконскіх, што мелі маёнткі на тэрыторыі сучаснай Брэсцкай вобласці, былі звязаны з паўстаннем 1863 г. Гэты род паходзіў з вёскі Дзяконе, якая зараз знаходзіцца ў Падляскім ваяводстве Польшчы. Памежнае становішча гэтага рэгіёну спрыяла таму, што прадстаўнікі роду Дзяконскіх праявілі сябе як на Беласточчыне, так і на землях Заходняй Беларусі.

У XIX ст. існавала некалькі галін роду, з якіх намі вылучаны галіна Яна Валынца і пятровічская галіна (ад назвы маёнтку Пятровічы ў Кобрынскім павеце). Гэтыя галіны былі роднаснымі, аднак ступень гэтай роднасці вызначыць не атрымалася.

У Траецкім касцёле г. п. Шарашова ў Пружанскім раёне можна ўбачыць памятную мармуровую дошку, прысвечаную Дзяконскім, на якой напісана: “Астанкам благаслаўленнай памяці Казімежа, які памёр у 1845 г. ва ўзросце 82 гады, Ганне з Мучынскіх, якая памерла ў 1829 г. у 60 гадоў мужа і жонкі Дзяконскіх удзячныя дзеці”. Пакуль не атрымалася з поўнай доляй верагоднасці даказаць іх дачыненне да якой-небудзь галіны рода. У ваколіцах Шарашова Казіміру Дзяконскаму належыў маёнтак Крыніцы. З тэксту мармуравай дошкі вынакае, што дзяцей у Казіміра і Ганны было некалькі. Аднак на сённяшні дзень можна дакладна назваць імя толькі аднаго іх сына Францішка, які нарадзіўся каля 1805 г. Ён павянчаўся ў Шарашоўскім касцёле 23 лістапада 1840 г. з шаснаццацігадовай Эрнесцінай Яблонскай з маёнтка Зарэчча. Бацькамі Эрнесціны былі Станіслаў і Тэафіля з Кер-

***Попко Ольга Николаевна,*** *старший преподаватель кафедры философии и культурологии Брестского государственного технического университета.*
*Беларусь, БрГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*

ноўскіх Яблонскія [6, арк. 80 адв.]

Пасля смерці бацькі Францішак стаў гаспадаром маёнтку Крыніцы ў Пружанскім павеце. У 1861-1862 гг. адразу пасля правядзення рэформы па адмене прыгоннага права, у в. Крыніцы памешчыкаў Франца і Эрнесціны Дзяконскіх пражывала 116 часова абавязаных сялян, у самім маёнтку жыло 9 дваравых. За вёскай лічылася 286 дзес. зручнай зямлі, а за маёнткам – 378 дзесяцін [2, арк. 286 адв.-287]. З усяго відаць, што Франц быў не вельмі заможным чалавекам. Дадзеных пра іншыя маёнткі, якія б яму належылі, знайсці не атрымалася.

У 1863 г. Францішак Дзяконскі быў абвінавачаны ў садзейнічанні паўстанцам. Пасля падаўлення паўстання разрозненыя групы яго ўдзельнікаў блукалі па лясах і аддаленых вёсках, хаваючыся ад рускай арміі. Адна з такіх невялікіх груп – чатыры чалавекі – трапіла ў маёнтак Крыніцы. Мясцовы селянін Іосіф Глушко паведаміў вайсковым уладам аб тым, што гаспадар маёнтка прыймаў у сябе паўстанцаў і даў ім вячэру. Ён таксама сцвярджаў, што Дзяконскі палохаў яго помстай паўстанцаў, калі даведаўся аб тым, што Глушко яго выдаў. Як пісаў у сваім рапарце ваенны начальнік г. Пружаны гвардзіі капітан (прозвішча ў дакуменце неразборлівае): "Сверх сего Глушко взводил обвинения на сельского старшину (Івана Барысевіча), державшего сторону помещика и научавшего крестьян, в случае нападения мятежников в показании на него Глушко, как на главного распорядителя в принятии мер предосторожности против мятежников" [3, арк. 4 адв.]

Следства паказала, што 4 паўстанцы на самой справе былі ў маёнтку. Аднак, па словах мясцовых сялян, да памешчыка не заходзілі. Толькі адзін з іх, па прозвішчу Залескі, узяў бок Глушко. Глушко і Залескі пад прысягай паказалі, што кучар памешчыка Міхал Клімец і повар Людвік Рачук праз лес адвялі паўстанцаў да падляснічага Белавежскай пушчы Мачульскага.

Дзяконскі абвяргаў гэтыя абвінавачванні і тлумачыў, што Глушко імкнецца адпомсціць яму за тое, што быў схоплены пры крадзяжу леса. Ваенны начальнік Пружан накіраваў у вёску для далейшага следства прапаршчыка Мелеха, які апытаў сялян і высветліў, што нібыта Дзяконскі хаваў у сябе зброю, якую аддаў завітаўшым да яго паўстанцам. У той момант Ваенны начальнік Пружан прыняў рашэнне выдаліць з маёнтку жонку Дзяконскага, каб тая не мела ўплыву на паказанні сялян і прапанаваў Ваенна-следчай камісіі працягнуць следства. Высветлілася, што абвінавачанне ў захаванні зброі было безпадстаўным, а сам Глушко на гэты конт блытаўся ў паказаннях. Аднак на вочнай стаўцы сяляне Сцяпан Мікулік і стараста Іван Барысевіч падцвердзілі, што чулі ад кучара і повара прызнанне ва ўчынку. На думку Ваеннага начальніка Пружан: "Из всех обстоятельств дела и принимая во внимание подозрительное обвинение главного обвинителя Иосифа Глушко, человека смелого и по характеру нисколько не похожего на здешних крестьян, и ненависть крестьян к помещикам, высказывающуюся при каждом удобном случае, я полагаю, что помещик Дзеконский в приписываемых ему поступках невиновен. Случай, что мятежники зашли в его имение, легко объясняется самим местоположением его близ Беловежской пущи. Наконец самый характер его и прежняя репутация заставляют сомневаться в его виновности. Люди служившие, по моему мнению, остаются в подозрении…

Вообще, вникнув во все факты дела, я пришёл к убеждению, что не влияние жены помещика Дзеконского было причиной не подтверждения показаний Глушко, а влияние Глушко было причиной обвинений, взведённых на Дзеконского" [3, арк. 6 адв.-7].

Аднак яшчэ на самым пачатку следства, у верасні 1863 г. памешчык-каталік Францішак Казіміравіч Дзяконскі (56 гадоў) і яго služачыя праваслаўныя: эканом Павел Васільевіч Саўчук (40 гадоў), лакей Андрэй Цімафеевіч Рабчук (22 гады), повар Людвік Цімафеевіч Рабчук (22 гады) і конюх Міхал Ільіч Клімец (21 год) былі арыштаваны і ўтрымліваліся ў Пружанах [3, арк. 1-4]. У восень і зіму 1863 г. у Пружанах дзейнічала вайсковая камісія, якая даследавала ход паўстання на Пружаншчыне і ступень віны мясцовых жыхароў. Арыштаваных утрымлівалі ў прыватных дамах. Сярод іх знаходзіўся і памешчык Францішак Дзяконскі з маёнтку Крыніцы [15, с. 25].

Было прынята рашэнне аддаць Дзяконскага і яго слуг пад ваенна-палявы суд. Пасля 24 снежня яны былі перавезены ў Гродна, а 14 лютага 1864 г. быў вынесены прысуд. Падсудныя сваёй віны не прызналі, а сам суд пасля разгляду справы прыйшоў да высновы, што ясных доказаў супраць абвінавачаных няма, таму іх неабходна вызваліць з-пад арэшту. Сялян вырашылі аддаць на парукі Сухапальскаму сельскаму грамадству і накіраваць па месцы жыхарства, назад у вёску Крыніцы.

Дзяконскі пасля суду заставаўся ў Гродзенскім турэмным замку, яго лёс павінен быў вырашыць сам Гродзенскі генерал-губернатар. Некаторы час не маглі вызначыцца, як яго пакараць. Усё ж такі ў турме ён адсядзеў амаль цэлы год, а прасіць прабачэння ўлады не збіраліся. Існавала прапанова прымусіць яго плаціць штраф 50 руб. Занепакоеная яго лёсам жонка Эрнесціна 26 чэрвеня 1864 г. напісала дакладную запіску на імя Начальніка Гродзенскай губерні: "Муж мой помещик Пружанского уезда Франц Дзеконский уже год как томится в тюремном заключении и чрез то всё более и более при преклонных своих летах чахнет и опасаюсь напредь за весьма худых последствий, если заключение сверх ожиданий, ещё продлиться. Зная невиновность мужа, страдающего лишь по клевете злоумышленности одного лишь из временно обязанных крестьян, я осмелюсь просить Ваше Превосходительство снисхождения уволить его, впредь до окончательного решения дела, под надзор полиции на поручительство, которое при сём представляю" [3, арк. 20-20 адв.]

Да гэтага дакумента далучалася паручыцельства, падпісанае трыма памешчыкамі Гродзенскай губерні: рэчаісным стацкім саветнікам Купрывіцкім (?), памешчыкам Слонімскага павету Эдуардам Казіміравічам Рагозай і памешчыкам Гродзенскага павету, калежскім асэсарам Станіславам Вікенцьевічам Прушынскім. Паручыцелі абяцалі, што Ф. Дзяконскі ніколі не будзе належыць да палітычных спраў супраць урада. Калі ж такое адбудзецца, яны абавязваліся выплаціць штраф ад 300 да 900 руб.

Францішак Дзяконскі быў вызвалены з-пад арышту толькі 26 жніўня 1864 г., яму дазволілі жыць у маёнтку Крыніцы [3, арк. 23-25]. Год смерці і далейшы лёс яго, а таксама нашчадкі не вядомы.

Складаны лёс напаткаў Караля, аднаго з прадстаўнікоў пятровічскай галіны роду, сына Тадэвуша Дзяконскага. Ён нарадзіўся 10 кастрычніка 1840 г. у маёнтку Радванічы Царкоўныя Брэсцкага павету і атрымаў пры хрышчэнні патройнае імя Караль-Антоній-Альбін. Хрышчонымі бацькамі хлопчыка былі родны дзядзька Ян Дзяконскі і ўдава падкаморына Тэкля Бельская. На хрышчэнні прысутнічалі палкоўнік рускіх войск Ксаверы Кукель і Марыянна Выганоўская, удава прэзідэнта [7, арк. 29 адв.] Маці хлопчыка, Эльжбета, паходзіла з мясцовага шляхецкага роду Выганоўскіх. Караль быў адным з чатырох братоў. Старэйшы з іх, відаць, Ян (гады нараджэння і смерці не вядомыя). Потым ішлі Альбін (1838-1918), Караль (1840-?) і самы малодшы Севярын (1842-?). У 1845 г. памёр бацька гэтых хлопчыкаў, 35-цігадовы памешчык Тадэвуш Дзяконскі [8, арк. 87].

Спачатку Караль вычыўся ў Марымонцкім сельскагаспадарчым і лясным інстытуце. Гэтая навучальная ўстанова знаходзілася недалёка ад Варшавы і была заснавана ў 1816 г. Першапачатковa перад інстытутам ставілася мэта падрыхтоўкі адукаваных землеўладальнікаў, якія б мелі практычныя навыкі вядзення гаспадаркі і маглі паспяхова кіраваць маёнткамі. Для навучання прыймаліся юнакі з 17 гадовага ўзросту. У 1857 г. інстытут перацярпеў шэраг рэформаў – было зачынено лясное аддзяленне. Навучальная ўстанова была зачынена, разлічанай на 150 выхаванцаў. Прыблізна ў гэты самы час, калі студэнтам інстытута стаў Караль Дзяконскі, туды мог трапіць толькі юнак, які меў веды ў аб'ёме 6 класаў гімназіі, за выключэннем старажытных моваў. Навучанне працягвалася тры гады замест папярэдніх двух. Акрамя тэарэтычных агранамічных ведаў навучэнцы атрымлівалі практыку палявых работ і сельскагаспадарчых назіранняў [1]. Невядома, ці скончыў Караль курс адукацыі ў гэтым інстытуце.

У жніўні 1860 г. без экзаменаў малады чалавек быў прыняты ў Горы-Горацкі земляробчы інстытут, дзе ён правучыўся да вясны 1863 г. Падчас навучання ў інстытуце Караль паказаў вельмі добрыя паводзіны, аднак у пачатку 1863 г. падаў прашэнне аб выключэнні

яго з інстытута. 23 сакавіка 1863 г. ён атрымаў дазвол на праезд у Царства Польскае і Гродзенскую губерню, які дзейнічаў 3 месяцы [11, арк. 28-29]. Невядома, чым аргументаваў Дзяконскі сваё рашэнне аб перарванні адукацыі. Верагодна, яго родныя нічога не ведалі аб гэтым учынку. Аднак далей яго крокі падаліся падазронымі, таму што ў родны маёнтак Дзяконскі не паехаў, нягледзячы на тое, што атрымаў з дому грошы на дарогу [12, арк. 42 адв.-43].

Караль быў членам горацкага рэвалюцыйнага камітэта. Падрыхтоўка да паўстання прымусіла яго кінуць навучанне. Караль часта наведваў Вышаву, маёнтак памешчыка Ігната Цэханавецкага, дзе збіралася моладзь і абмяркоўваліся рэвалюцыйныя праграмы, тут быў склад лекаў і зброі. Караль Дзяконскі паказаў сябе таленавітым арганізатарам і агітатарам. На яго кватэры, якую ён здымаў разам са студэнтам Коўзанам, захоўвалася нелегальная літаратура [14, с. 34, 37].

У ноч з 5 на 6 мая 1863 г. горацкія паўстанцы, падзеленыя на пяць аддзелаў па 20-25 чалавек, накіраваліся ў Горкі з ваколіц з мэтай заняць асноўныя ўстановы горада. Караль Дзяконскі ўзначаліў І-шы аддзел, які павінен быў захапіць кіраўніка каманды ўнутранай варты Мышкоўскага. Кватэра Мышкоўскага ахоўвалася прыблізна дзесяткам салдат. Завязалася перастрэлка, падчас якой было забіта пяць салдат і загарэўся дом. Паўстанцы, сярод якіх быў і Караль, выхоплівалі людзей з палаючага дома. Дзяконскі таксама ўдзельнічаў у рэквізацыі коней, павозак, аўсу і іншага патрэбнага для паўстанцаў з гаспадаркі земляробчага інстытута. 12-13 мая паўстанцы здаліся, абкружаныя войскам і мясцовымі сялянамі ў Кульчыцкім лесе недалёка ад горада Прапойска* [14, с. 50-51, 65, 72].

Большасць абвінавачаных, у тым ліку і Дзяконскі, паводзілі сябе на судзе незалежна і смела. Падчас следства высвятлілася, што Караль Дзяконскі займаў высокае становішча сярод паўстанцаў. Сведкі сцвярджалі: "Ходкін, селянін з Горак, паказаў, што калі ён сядзеў на страсе свае хаты і паліваў яе вадой, абараняючы ад пажару, то паўстанец Дзяконскі загадаў яму злезці са страхі і за непаслушэнства выстраліў у яго, але куля праляцела міма. Гінодман, горацкі яўрэй, паказаў, што Дзяконскі больш за іншых вінаваты ў паўстанні, бо да паўстання ён часта ездзіў да пана Цэханавецкага, які таксама прыймаў шчыры ўдзел у паўстанні, а напярэдадні самага паўстання цэлы дзень правёў у кватэры Цэханавецкага і праводзіў яго, пры ад'ездзе з Горак, за горад" [14, с. 81].

Магілёўскі суд болей за два гады разглядаў справы горы-горацкіх паўстанцаў. Першымі, яшчэ ў 1863 г., прысуд атрымалі вучні і студэнты, большасць з якіх былі прызнаны за кіраўнікоў паўстання. У наступны год разглядаліся справы педагогаў і чыноўнікаў, апошнімі ў 1865 г. – справы памешчыкаў [14, с. 89]. Па рашэнні суда ў 1864 г. Караль Дзяконскі быў асуджаны на 8 гадоў катаргі [5, арк. 17]. 3 мая 1864 г. некалькі арыштаваных, сярод якіх быў Дзяконскі, з прычыны хваробы адмовіліся выязджаць па этапу з Магілёва, але лекары не пацвердзілі факт хваробы. Праз некалькі дзён, 9 мая Караль адправіўся ў свой далёкі і складаны шлях даўжынёй у 7 тысяч вёрст. Да Смаленска заключаныя павінны былі ехаць на падводзе. Маці Караля звярнулася да губернатара Беклямішава з просьбай дазволіць яе сыну даехаць да Смаленска паштовымі коньмі і аплаціла дарогу [14, с. 100-101].

Самыя позднія звесткі пра Караля тычацца жніўня 1868 г. Вядома, што ў гэты час ён адбываў пакаранне ў Іркуцку, дзе працаваў на сяляварным заводзе [14, с. 109]. Магчыма, ён памёр у Сібіры, таму што пазней пра яго не згадваюць дакументы роду. Судовая справа ўтрымлівае некаторую інфармацыю аб прыватным жыцці Караля. Згадваецца, што ён "меў сяброўку – нейкую дзявіцу Аляксандру Якаўлеву" [10, арк. 20].

Па рашэнні суда доля спадчыны, якая прызначалася Каралю, была канфіскавана ў казну. Такім чынам род страціў маёнтак Радванічы Царкоўныя з хутарам Заказы (?), стражай Гускі, якія знаходзіліся ў Брэсцкім павеце, і розную рухомасць, якая знаходзілася ў гэтых уладаннях. Плошча маёнтку Радванічы Царкоўныя на момант канфіскацыі складала 1332 дзес. 2160 кв. саж., і ён быў ацэнены ў 20 тыс. 758 руб. 58 кап. [9, арк. 1]. Зразумела, што гэта быў значны ўдар па маёмасным стане гэтай сям'і. Браты Дзяконскія былі пазбаўлены бацькоўскага дому, у якім амаль усе яны нарадзіліся і выраслі.

Малодшы брат Караля, Севярын Дзяконскі ў 1863 г. быў абвінавачаны расійскімі ўладамі ў зносінах з паўстанцамі, быў арыштаваны і сядзеў у Кобрынскім астрозе [4, арк. 113 адв.] Верагодна, Севярын быў выпушчаны праз некаторы час, таму што яго далейшае жыццё праходзіла ў Кобрынскім павеце.

Пасля падаўлення паўстання 1863 г. улады вельмі насцярожана адносіліся да мясцовай шляхты, любыя зборы мясцовых памешчыкаў ўспрымаліся як нарады будучых паўстанцаў. 25-26 жніўня 1866 г. у булькоўскім лесе гаспадар маёнтка Булькова граф Станіслаў Францавіч Ажароўскі праводзіў паляванне для суседніх памешчыкаў і чыноўнікаў, сярод якіх былі Кобрынскі ваенны начальнік палкоўнік Нордштэйн і Альбін Дзяконскі. Мясцовая паліцыя ўбачыла ў гэтым паляванні пагрозу. У графа Ажароўскага пачаліся праблемы з паліцыяй, тым больш, што яго сябра Нордштэйна знялі з пасады. Графа вырашылі аштрафаваць на 100 рублёў, а ўсіх астатніх удзельнікаў палявання – на 50 рублёў. Альбін Дзяконскі абурыўся гэтым рашэннем, пісаў начальніку Паўночна-Заходняга краю генерал-ад'ютанту А.Л. Патапаву, што штраф накладзены няспраўядліва. Дзяконскі выказаў вельмі слушныя аргументы. Генерал-маёр Чарткоў прызначыў штраф, матывуючы тым, што Дзяконскі паехаў на паляванне, а значыць выдаліўся з месца жыхарства, без дазволу мясцовых улад. Аднак згодна з інструкцыяй 1863 г. без дазволу можна ад'ехаць на растаянне 30 вёрстаў. Маёнтак Булькова, у якім адбывалася паляванне межаваў з уладаннямі А. Дзяконскага, а Пятровічы ад Булькова падзяляла толькі 4 вярсты. Да таго ж Дзяконскі заехаў да графа Ажароўскага на палову гадзіны, каб развітацца перад ад'ездам у Пецярбург, дзе планаваў правесці ўсю зіму. Сыходзячы з гэтых аргументаў, Дзяконскі прасіў "уволить меня от взноса оного" [13, с. 108-109].

Падзеі 1863 г. вельмі цяжка адбіліся на сям'і Дзяконскіх. Па ложным абвінавачанні быў арэштаваны і прасядзеў у турме каля года пажылы памешчык Пружанскага павету Францішак Дзяконскі. Актыўным удзельнікам паўстання быў Караль (1840-?), сын Тадэвуша, уладальніка маёнтка Радванічы Царкоўныя ў Брэсцкім павеце. Караль вучыўся ў Горы-Горацкім земляробчым інстытуце, дзе далучыўся да рэвалюцыйнага камітэту. У пачатку мая горацкія паўстанцы захапілі ўладу ў горадзе. Праз тыдзень яны здаліся каля горада Прапоўска. Асуджаны на выгнанне ў Сібір, Караль згінуў на далёкіх расійскіх прасторах. Яго брат Севярын быў абвінавачаны ў спачуванні паўстанцам. Хутчэй за ўсё, нагляд за Севярынам і яго братамі працягваўся і пасля падаўлення паўстання. Нават удзел Альбіна ў паляванні ў 1866 г. быў успрыняты ўладамі, як супрацьпраўны ўчынак, за што яго прымушалі плаціць штраф.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ:


1. Маримонтский сельскохозяйственный и лесной институт. Энциклопедический словарь Брокгауза и Эфрона // www.be.sci-lib.com/article064280.html
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей НГАБ) у г. Гродна. Ф. 1, воп. 27, спр. 1617. Ведомости о количестве населённых и незаселённых земель, о количестве помещичьих земель по уездам губернии и по другим вопросам (1861-1862 гг.)
3. НГАБ у г. Гродна. Ф.1, воп. 34, спр. 799. Дело о предании суду помещика Пружанского уезда Дзеконского Казимира, обвиняемого в укрывательстве участников восстания 1863 г.
4. НГАБ у г. Гродна. Ф. 3, воп. 1, спр. 7. Дело со списками лиц, находящимися по арестом по г. Кобрину.
5. НГАБ у г. Гродна. Ф. 3, воп. 1, спр. 46. Алфавитный список политических преступников, лишённых по суду прав состояния, имущество коих подлежит конфискации по суду на 1 октября 1864 г.
6. НГАБ у г. Гродна. Ф. 484, воп. 1, спр. 3. Метрическая книга о бракосочетавшихся Шерошевского римско-католического костёла.


* Сучасны горад Слаўгарад.

7. НГАБ у г. Гродна. Ф. 904, воп. 1, спр. 29. Метрическая книга о родившихся, бракосочетавшихся и умерших Кобринского римско-католического деканата за 1840 г.
8. НГАБ у г. Гродна. Ф. 904, воп. 1, спр. 33. Метрическая книга о родившихся, бракосочетавшихся и умерших Кобринского римско-католического деканата за 1845 г.
9. НГАБ у г. Гродна. Ф. 1664, воп. 1, спр. 409. Записи помещиков Альбина, Северина и Ивана Дзеконских о разделе наследства. Вводный лист братьев Дзеконских во владение имениями.
10. НГАБ у г. Мінску. Ф. 2001, воп. 2, спр. 27, арк. 20. Дело о придании военно-полевому суду и другим мерам участников Горецкого повстанческого отряда и других причастных к прошедшим 23-24 апреля 1864 г. событиям в городе Горки.
11. НГАБ у г. Мінску. Ф. 3257, воп. 1, спр. 50. О разных бумагах, присланных в комиссию по предложению господина Начальника Могилёвской губернии от 25 мая 1863 г.
12. НГАБ у г. Мінску. Ф. 3286, воп. 1, спр. 1. Переписка с начальником полицейского управления Горецкого уезда об участниках восстания 1863 г. В Могилёвской губернии.
13. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Жабінкоўскага р-на / Рэд.-укл. Р. Смірнова. – Мінск: Ураджай. – 1999. – 510 с.
14. Цітовіч С. 1863 год у Горы-Горках (бывш. Магілёўскай губ.) Падзеі паўстання. – Менск: ізд-во БАН. – 1929. – 124 с.
15. Rozanów M. Powiat Prużański (szkic historyczny). Prużana. – 1935. – 143 с.


*Материал поступил в редакцию 11.11.08*


**POPKO O.N. The revolt of 1863-1863 in the history of Dziekonski family**

The article is dedicated to the quoters of the Dziekonski family, which ware connected to the revolt of 1863. Their possession were situated on the territory of modern Brest region. The most fissile participant of the revolt was Karol Dziekonski, which was son of the holder of the manor Radwanichi Cerkovnyje Tadeush (1810-1845). Karol was convicted for 8 years and sent in Siberia. The manor of his father was confiscated by Russians. Karols brother, Sewerin arrested after suspicion in assistance to the participants in Kobrin. The destiny of the elderly landowner Frantishek Dziekonski is tragic, which was arrested on false charge.

The author results the new facts, retrieved by him in the belarussian archives.


УДК 947.6

***Карпович О.В.***

# УЧАСТИЕ ДУХОВЕНСТВА В ВОССТАНИИ 1863-1864 ГГ. НА ЗЕМЛЯХ БЕЛАРУСИ

Степень участия представителей духовенства в восстании 1863-1864 гг. до настоящего времени изучена относительно слабо, несмотря на, казалось бы, хорошо изученную проблематику этого восстания в целом. Последние солидные публикации на эту тему были сделаны советскими учеными В.М. Зайцевым и С.М. Байковой еще в 60-70-е гг. прошлого века, которые проводили комплексное исследование сословного состава участников восстания. Но в этих исследованиях были использованы, в основном, материалы центральных архивов СССР в Москве и Ленинграде и Канцелярии Виленского генерал-губернатора Центрального государственного исторического архива Литвы в Вильнюсе. Данные белорусских архивов (в Гродно и Минске) касающиеся темы восстания 1863 г. до настоящего времени изучены относительно слабо. В статье на основе обширного материала белорусских архивов и других источников рассказывается о степени участия представителей духовенства в восстании 1863 г. на белорусских землях.

Следует сразу оговориться, что в восстании 1863-1864 гг. на белорусских землях принимали участие лишь представители католической и, в меньшей степени, православной церквей. Протестантское, мусульманское и иудейское духовенство к идеям восстания относилось равнодушно и оставалось лояльным действующей власти. По крайней мере, случаев какого-либо участия представителей иных церквей и конфессий в этом восстании зафиксировано не было.

Высшее католическое духовенство, как и православное вообще, было лояльным действующей власти и требовало этого же от своих подчиненных. В частности, Виленский католический епископ А. Красинский особым циркуляром от 30 января 1863 г. запретил католическому духовенству содействовать повстанцам и вмешиваться в политику. Представители средних слоев католического духовенства занимали позицию выжидания и напрямую не поддерживали восставших. Активную позицию сотрудничества с повстанцами, вплоть до прямого участия в восстании, занимали, в основном, низшие иерархи католической церкви.

Степень участия католических священников в восстании зависела от их численности по регионам проживания. Как будет видно из таблицы ниже, из белорусских земель наибольшей активностью в процентном соотношении отличилось духовенство Могилевской губернии. Внушительную активность проявило католическое духовенство Гродненской и Витебской губерний, хотя и представители католической церкви в восточных регионах находились под неусыпным контролем властей и «дружественным» наблюдением православных иерархов. Так, в Оршанском уезде православный священник Степан Дороткевич «лично доставлял мятежников» к властям [1, л. 99]. Однако, даже такие трудности не повлияли на довольно высокий процент участия католического духовенства Могилевщины и Витебщины в восстании.

Как правило, мелкое духовенство добровольно присоединялось к восстанию. Роль таких священников сводилась, в основном, к снабжению отрядов, агитации и вербовки среди местного населения. Брать в руки оружие священникам не позволяла вера. Так, снабженцем отряда Лянкевича в Гродненском уезде в числе прочих был ксендз Бучинский; в отряд Врублевского вербовал население ксендз Волицкий из Сокольского уезда; в отряде Баранцевича числились ксендзы Поплавский и Кушинский; священником отряда Козелла являлся ксендз Вилейского костела Клавдецкий; против ксендза Волковысского уезда Бонифация Писанко было выдвинуто обвинение в том, что повстанцы «собирались у него и пели политические гимны»; священником отряда Олендского в Могилевской губернии был ксендз Пржыалковский; в отрядах Влодека и Врублевского числился ксендз Монюшко [2, с. 41, 237, 239, 296; 3, с. 250; 4, с. 457] и т.д. Во многих отрядах священники принимали присягу у рядовых бойцов при вступлении в ряды повстанцев. Но были случаи и прямого участия католических священников в вооруженной борьбе. Широко известен случай о ксендзе Новогрудского костела Лашкевиче, которому пришлось возглавить повстанческий отряд в том же уезде вместо арестованного ранее в Мире капитана Генерального штаба Кароля Шалевича. Сам Лашкевич погиб в мае 1863 г. в Налибокской пуще в ходе столкновения с войсками. В Брестском уезде приобрел известность отряд бывшего воспитанника духовной семинарии Стасякевича, получившего боевой опыт в качестве начальника штаба у

***Карпович Олег Валерьевич,*** *аспирант кафедры истории славянских стран Гродненского государственного университета им. Я.Купалы. Беларусь, ГрГУ, 230023, г. Гродно, ул Э. Ожешки, 22.*